Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 4 (695) ● ПЯТНІЦА, 26 СТУДЗЕНЯ 1968 г. ● Цана 2 кап. Год выдання XXI

## ПЛЕНУМ ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ БЕЛАРУСІ

**22—23 студзеня г. г. адбыўся пленум Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Беларусі. Пленум заслухаў і абмеркаваў даклад кандыдата ў члены Палітбюро ЦК КПСС, першага сакратара КП Беларусі П. М. Машэрава «Аб мерах па рэалізацыі абавязацельстваў, прынятых у вытворчых калектывах, па датэрміноваму выкананню пяцігадовага плана развіцця народнай гаспадаркі і дастойнай сустрэчы 50-годдзя Беларускай ССР і Кампартыі Беларусі». Па абмеркаванаму пытанню прынята пастанова.**

**У сувязі з выбраннем С. О. Прытыцкага Старшынёй Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР пленум вызваліў яго ад абавязкаў сакратара ЦК КПБ. Сакратаром і членам бюро ЦК КПБ выбран У. Ф. Міцкевіч. У сувязі з пераходам на работу за межы рэспублікі пленум вызваліў С. С. Марахіна ад абавязкаў кандыдата ў члены Бюро ЦК КПБ. Пленум выбраў кандыдатам у члены Бюро ЦК КПБ Г. М. Машкова.**

## СЕСІЯ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

22 студзеня ў Мінску адбылася трэцяя сесія Вярхоўнага Савета Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі.

Вярхоўны Савет аднагалосна прымае пастанову аб выбранні таварыша ПРЫТЫЦКАГА Сяргея Осіпавіча Старшынёй Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР і пастанову аб выбранні тав. КЛІМАВА Івана Фролавіча намеснікам Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

## ПАСТАНОВА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БЕЛАРУСКАЙ ССР

### Аб выбранні тав. ПРЫТЫЦКАГА С. О. Старшынёй Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР

Вярхоўны Савет Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі пастанаўляе:

Выбраць тав. ПРЫТЫЦКАГА Сяргея Осіпавіча Старшынёй Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

Намеснік Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР
Ф. СУРГАНАЎ.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР
Д. ЛУКАШЭВІЧ.

22 студзеня 1968 года, гор. Мінск.

## ПАСТАНОВА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БЕЛАРУСКАЙ ССР

### Аб выбранні тав. КЛІМАВА І. Ф. намеснікам Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР

Вярхоўны Савет Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі пастанаўляе:

1. Увесці ў Прэзідыуме Вярхоўнага Савета Беларускай ССР пасаду вызваленага намесніка Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

2. Выбраць тав. КЛІМАВА Івана Фролавіча намеснікам Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, вызваліўшы яго ад абавязкаў намесніка Старшыні Савета Міністраў Беларускай ССР.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР
С. ПРЫТЫЦКІ.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР
Д. ЛУКАШЭВІЧ.

22 студзеня 1968 года, гор. Мінск.

## ПОСПЕХІ ПАТРЫЯТЫЧНАГА ТАВАРЫСТВА

Такі знак уручан нядаўна універсітэцкай арганізацыі ДТСААФ, якая заняла трэцяе месца сярод вышэйшых навучальных устаноў у Рэспубліканскім конкурсе-аглядзе абаронна-масавай работы ў гонар 50-годдзя Вялікага Кастрычніка.

Поспехі нашых актывістаў ДТСААФ адзначаны таксама Граматай камітэта ДТСААФ і пераходным прызам Ленінскага раёна г. Мінска і Граматай Беларускага рэспубліканскага камітэта ДТСААФ.

На здымках нашага карэспандэта І. Аскіркі вы бачыце заняткі парашутнай секцыі (унізе); уверсе — ветэраны ДТСААФ Герой Савецкага Саюза А. В. Кірсанаў і палкоўнік запаса Г. П. Іваноў у час пасяджэння камітэта ДТСААФ БДУ.





## У ГОНАР ЮБІЛЕЮ САВЕЦКАЙ АРМІІ

Адбылося пасяджэнне камісіі, створанай для арганізацыі ўрачыстасці ў гонар 50-годдзя узброеных сіл СССР. Камісія абмеркавала шэраг арганізацыйных пытанняў, вызначыла адказных за правядзенне гутарак, лекцый, сустрэч з удзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны.

На ўсіх факультэтах з 19 па 22 лютага адбудуцца ўрачыстасці, прысвечаныя нашай доблеснай Савецкай Арміі. Дзень 23 лютага калектыў універсітэта разам з усім народам адзначыць як вялікае свята.

## З УЗНАГАРОДАЙ, ВІКТАР РЫГОРАВІЧ!

Радасная вестка прыйшла днямі ва універсітэт. За актыўную навукова-педагагічную дзейнасць і ў сувязі з шасцідзесяцігоддзем з дня нараджэння загадчык кафедры фізічнай геаграфіі замежных краін прафесар Віктар Рыгоравіч Заўрыеў узнагароджан Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

Вядомы даследчык, выдатны педагог В. Р. Заўрыеў карыстаецца павагай выкладчыкаў і любоўю студэнтаў. Віншуючы з узнагародай, мы жадаем юбіляру сталай бадзёрасці, новых творчых поспехаў у працы.

## ЗА ДАЛЕЙШАЕ РАЗВІЦЦЁ УНІВЕРСІТЭЦКАГА НАВУЧАННЯ

З ВЫСТУПЛЕННЯ РЭКТАРА БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА ПРАФЕСАРА А. Н. СЕЎЧАНКІ НА ПЛЕНУМЕ ЦК КПБ.

**У вырашэнні грандыёзных задач пяцігадовага плана, гаворыць А. Н. Сеўчанка, велізарная роля належыць вышэйшым навучальным установам, якія заклікаць забяспечваць далейшае развіццё савецкай навукі, рыхтаваць высокакваліфікаваных спецыялістаў для ўсіх галін народнай гаспадаркі. У сувязі з гэтым ёсць неабходнасць больш рашуча паставіць пытанне аб развіцці ў нашай рэспубліцы універсітэцкай адукацыі. Беларускі дзяржаўны універсітэт дзякуючы клопатам партыі і ўрада за апошнія гады вельмі вырас. Цяпер у ім на стацыянары, вячэрнім аддзяленні і завочна займаецца больш як 15 тысяч чалавек. Падрыхтоўка кадраў ідзе па 40 спецыяльнасцях. Рэзка ўзрос прыём на фізічны, хімічны, матэматычны і біялагічны факультэты. Моладзь ахвотна ідзе ў навуку. За адзін толькі год у Беларускім дзяржаўным універсітэце абараняюць кандыдацкія і доктарскія дысертацыі 70—80 чалавек.**

**Але ўсё ж адзін наш універсітэт задаволіць патрэбнасці рэспублікі ў кадрах спецыялістаў не можа. Трэба было б адкрыць паралельна другі універсітэт. Такая думка ўжо выказвалася. Я думаю, да яе трэба прыслухацца. Тав. Сеўчанка крытыкаваў Міністэрства прамысловага будаўніцтва за слабую работу па асваенню капіталаўкладанняў, які выдзяляюцца для будаўніцтва вытворчых плошчаў і інтэрнатаў універсітэта.**

**(«Звязда», 24 студзеня 1968 г.).**

**Сёння мы прысвячаем старонкі газеты завочнаму факультэту, на якім у разгары сесія.**

# ГАРАЧАЯ ПАРА

*У. БАГДАНАЎ,*
*дэкан завочнага факультэта, кандыдат гістарычных навук.*

Рэктарат, партыйны камітэт, дэканат і многія кафедры пастаянна ўдзяляюць вялікую ўвагу ўдасканаленню сістэмы завочнага навучання. І гэта заканамерна, бо амаль трэцюю частку студэнтаў складаюць завочнікі. Завочны факультэт рыхтуе кадры па дзесяці спецыяльнасцях. Многія выпускнікі пасля заканчэння паказваюць узоры высокакваліфікаванай працы, з удзячнасцю ўспамінаюць сваіх выкладчыкаў. Але мы яшчэ не можам сказаць, што калектывам усё зроблена для таго, каб стварыць неабходныя ўмовы для паспяховай вучобы тым, хто не мае магчымасці праводзіць у бібліятэках, лабараторыях і студэнцкіх аўдыторыях многа часу.

Зусім нядаўна, у снежні мінулага года, рэктарат заслухаў справаздачу дэкана завочнага факультэта. Было адзначана, што супрацоўнікі факультэта справядліва звяртаюць галоўную ўвагу на вучэбны працэс і аказанне своечасовай дапамогі студэнтам у іх самастойнай працы ў перыяд паміж экзаменамі. У мінулым навучальным годзе для правядзення лекцый і семінарскіх заняткаў было прыцягнута 45 прафесароў, дактароў навук, 242 дацэнты і кандыдаты навук, а ўсяго каля 600 выкладчыкаў. Як і раней, кожнаму завочніку своечасова ўручаліся праграмы і заданні, тэматыка кантрольных і курсавых работ, размяркоўваліся вучэбна-метадычныя дапаможнікі. Добрую ініцыятыву праявілі многія кафедры, якія пачалі практыкаваць разам з вуснымі кансультацыямі пісьмовыя. Гэта прынесла добры плён, таму што не ўсе студэнты маюць магчымасць перыядычна наведваць універсітэт.

На рэктараце адзначалася таксама, што поўнасцю апраўдала сябе практыка — увядзенне дня завочніка. Два разы ў месяц на кафедрах арганізаваны дзяжурствы прафесараў і выкладчыкаў, і студэнты-завочнікі ў гэтыя дні атрымліваюць кваліфікаваныя кансультацыі, ліквідуюць акадэмічную запазычанасць і нават маюць магчымасць датэрмінова здаваць залікі і экзамены.

Кафедры і дэканат завочнага факультэта яшчэ больш узмацнілі кантроль за якасцю і своечасовасцю рэцэнзіравання пісьмовых работ. Да таго ж, кафедры абавязалі выкладчыкаў у час сесіі праводзіць субясеДаванні па выкананых і прадстаячых заданнях.

Вялікія клопаты універсітэт праяўляе па забеспячэнню студэнтаў-завочнікаў неабходнай літаратурай. З году ў год пашыраецца спецыяльны кніжны фонд, які створан для завочнікаў у бібліятэцы. Дастаткова сказаць, што ў мінулым навучальным годзе ім было выслана 1.500 экземпляраў кніг. Наогул, амаль 50 працэнтаў кніг бібліятэка выдае завочнікам. Важна і тое, што з кожным месяцам умацоўваюцца сувязі дэканата з прадпрыемствамі і ўстановамі, у якіх працуюць студэнты-завочнікі. Гэта дае магчымасць сачыць за належнымі ўмовамі для вучобы. Дэканат заўсёды гатоў ахоўваць правы завочніка, як толькі атрымае трывожны сігнал. Дарэчы, у наш адрас ідзе нямала пісем, і ні адно з іх не застаецца без увагі.

Усе гэтыя і іншыя мерапрыемствы садзейнічалі паляпшэнню паспяховасці студэнтаў. Так, у летнюю сесію 528 завочнікаў з 3.534 здалі ўсе экзамены толькі на выдатна і добра. Сотні студэнтаў атрымалі толькі па адной — дзве «здавальняюча». Аднак пры агульным росце паспяховасці ўсё яшчэ вялікая колькасць завочнікаў займаецца пасрэдна. На «здавальняюча» вытрымалі сесію 657 чалавек, з іх 215— першакурснікі. Паўстае пытанне аб арганізацыі нейкіх дадатковых мерапрыемстваў па арганізацыі плённай працы малодшых курсаў. І тут хочацца вось аб чым сказаць. Колькі б дэканат, кафедры і ўсе выкладчыкі ні працавалі над паляпшэннем вучэбнага працэсу, усё гэта не дасць належных вынікаў, калі самі студэнты не зразумеюць, што глыбіня і ўзровень іх ведаў залежаць перш за ўсё ад іх саміх, ад таго наколькі арганізавана і інтэнсіўна яны будуць працаваць над вывучэннем праграмнага матэрыялу ў міжсесійны перыяд. Толькі бессістэмнай, недабрасумленнай працай саміх студэнтаў можна растлумачыць той факт, што ў мінулым навучальным годзе за непаспяховасць з універсітэта выключана 200 завочнікаў.

Зацвердзіўшы цэлы шэраг мерапрыемстваў па далейшаму паляпшэнню завочнага навучання, рэктарат запатрабаваў ад загадчыкаў кафедраў узмацніць кантроль за якасцю заняткаў, якія праводзяцца са студэнтамі. Не сакрэт, што некаторыя выкладчыкі, будучы перагружанымі працай на стацыянары, не заўсёды паспяваюць падрыхтаваць на належным узроўні лекцыі. Мэтазгодна таму перагледзець вучэбную нагрузку тых, хто заняты на завочным факультэце. Усе кафедры абавязаны распрацоўваць метадычныя дапаможнікі, рыхтаваць тэксты лекцый па найбольш складаных і цяжкіх дысцыплінах і раздзелах навук, у першую чаргу па прадметах, па якіх яшчэ няма падручнікаў.

У святле Пастановы ЦК КПСС «Аб мерах па далейшаму развіццю грамадскіх навук і павышэнні іх ролі ў камуністычным будаўніцтве» павінна быць удзелена максімальная ўвага вывучэнню студэнтамі гісторыі КПСС, філасофіі, палітэканоміі, навуковага камунізма і нішых грамадскіх дысцыплін. Ажыццяўленне гэтага важнага партыйнага рашэння дасць магчымасць не толькі палепшыць тэарэтычную падрыхтоўку, але і ўзмацніць ідэйную загартоўку маладых спецыялістаў, зрабіць іх маральна падрыхтаванымі да выканання самых складаных задач камуністычнага будаўніцтва.

Сесія ў завочнікаў пачалася. У гэтыя дні студэнты павінны не толькі ўважліва праслухаць лекцыі, паспяхова здаць экзамены, але і знайсці час для таго, каб атрымаць кансультацыі і парады на будучае. Ужо цяпер трэба параіцца са сваімі выкладчыкамі адносна вучэбных дапаможнікаў, якія спатрэбяцца пры падрыхтоўцы да будучых экзаменаў, або працы над курсавымі і кантрольнымі работамі. Асабліва многа прыдзецца папрацаваць выпускнікам. Усе яны павінны сустрэцца з навуковымі кіраўнікамі сваіх дыпломных прац, нажыць новую літаратуру.

Дэканат, усе супрацоўнікі факультэта і выкладчыкі жадаюць завочнікам у юбілейным годзе рэспублікі з асаблівымі поспехамі закончыць сесію.

## АДНА ГАДЗІНА Ў КАНЦЫЛЯРЫІ

Амаль не зачыняюцца дзверы канцылярыі завочнага факультэта. Апошнія дні перад пачаткам сесіі напоўнены самымі разнастайнымі клопатамі. З якімі толькі пытаннямі не заходзяць сюды!

— Не атрымала выкліку на сесію, — скардзіцца першакурсніца. — Хвалююся, у чым справа?

Тут жа выяўляюцца прычыны.

А гэтаму таварышу трэба тэрмінова адзначыць дакументы.

— Праз гадзіну — самалёт. Да каго я павінен звярнуцца?

— Прыслалі выклік з неаплатным водпускам, а ў мяне ўсе кантрольныя здадзены ў тэрмін і залічаны...

І супрацоўнікі канцылярыі Марыя Віктараўна Свісцельнікава, Ніна Аляксандраўна Парошына, Галіна Фамінічна Шаўлюкевіч, Вольга Сямёнаўна Жалезкіна і іншыя разбіраюць скаргі, даюць парады, дапамагаюць.

Толькі адна перапіска з завочнікамі займае некалькі ёмістых папак.

Пісьмы ідуць з розных куткоў краіны: з Поўначы і Далёкага Ўсходу, з Арменіі і Узбекістана. А Беларусь... Яна, відаць, прадстаўлена ўсімі, нават самымі аддаленымі раёнамі.

Па самых розных адрасах выходзяць з канцылярыі паведамленні аб правілах прыёму, тэрмінах экзаменаў, кансультацыях. Адсюль ідуць і непрыемныя весткі: выключэнне за акадэмічную запазычанасць.

Моцнымі ніцямі звязан універсітэт са сваімі студэнтамі. Адлегласць не перашкода, калі дакладна і рытмічна працуе апарат завочнага факультэта ва ўсіх яго звеннях. Вось чаму, заканчваючы вну, студэнты дзякуюць не толькі выкладчыкаў, метадыстаў, бібліятэкараў, але і работнікаў канцылярыі, чыя праца таксама садзейнічала іх паспяховай вучобе.

**А. АЛЕНІЧ.**



УВАЖЛІВА СЛУХАЮЦЬ ЛЕКЦЫЮ ШАСЦІКУРСНІКІ АДДЗЯЛЕННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ.
Фота І. Аскірні.

## На фінішнай прамой

Бягучая сесія ў нас, шасцікурснікаў, — апошняя. Вялікі і цяжкі шлях прайшла наша група да таго, як стаць на фінішную прамую. Дзесьці па дарозе мы згубілі сем чалавек. Не ўсе змаглі добра спалучаць працу і вучобу, а некаторыя проста не здолелі авалодаць філасофскімі навукамі. І вось засталося дзевятнаццаць чалавек, самых мужных. Так, самых мужных, таму што ў многіх, як, напрыклад, у геолага Валянціны Борздай, праца на самай справе не давала магчымасці своечасова і добра рыхтавацца да экзаменаў, сістэматычна вывучаць праграмны матэрыял. Такіх прыкладаў можна прывесці многа. Тое, што асноўныя цяжкасці ўжо пераадолены, сведчыць не толькі аб нашых поспехах, але і аб поспехах калектыва выкладчыкаў, якія, акрамя глыбокіх ведаў па сваіх дысцыплінах, надавалі нам упэўненасць у сваіх сілах і нават смеласць.

Вельмі цяжкай была сесія мінулага года, але прайшла яна паспяхова. З дзевятнаццаці студэнтаў дванаццаць атрымалі толькі выдатныя і добрыя адзнакі. Як заўсёды, прыкладам для нас былі змястоўныя адказы А. А. Зюзіна, М. П. Міхайлоўскага, У. І. Пішчалы, Ю. У. Карацеева. Па большасці прадметаў яны на працягу ўсёй вучобы паказваюць выдатныя веды.

Апошняя сесія. Даўно хацелася вымавіць гэтыя словы.

Адчуваецца, што група падрыхтавалася нядрэнна, хоць могуць быць розныя нечаканасці. Нам неабходна здаць чатыры экзамены і два залікі. Прычым, экзамены не з лёгкіх: асновы навуковага камунізма, марксісцка-ленінская эстэтыка, ленінскі этап гісторыі філасофіі, спецкурс па гісторыі грамадска-палітычнай і філасофскай думкі Беларусі другой паловы XIX стагоддзя. І ўсё ж мы спадзяемся на агульны поспех, прыкладзем ўсе сілы, каб і апошнюю сесію здаць паспяхова.

Цяпер у нас ідуць лекцыі, кожны старанна рыхтуецца да экзаменаў, і разам з тым усе думаюць аб завяршэнні вучобы, у першую чаргу, аб дыпломных. Тут таксама ёсць поспех. Усе ўжо даўно працуюць па выбраных тэмах, многія сабралі літаратурны і фактычны матэрыял, а такія студэнты, як В. І. Колесаў, А. А. Зюзін, Ю. У. Карацееў і іншыя, ужо зрабілі першыя чарнавыя варыянты дыпломных прац. Яны мяркуюць за перыяд сесіі атрымаць ад сваіх навуковых кіраўнікоў заўвагі, з тым каб адразу ж пасля экзаменаў дэталёва распрацаваць усе раздзелы сваіх студэнцкіх даследаванняў.

**Л. ЗЕМЛЯКОЎ,**
старацта шостага курса філасофскага аддзялення.

## ДОБРА З ТАКІМІ СТАРАСТАМІ

Несумненным стаў ужо факт, што ад старасты курса ў многім залежыць паспяховасць студэнта-завочніка. Добры староста — і курс своечасова забяспечан літаратурай, праграмамі, своечасова апавешчаны аб кансультацыях і практычных занятках. Ва ўсіх справах ён важак, арганізатар, памочнік.

Вось чаму аднолькавай павагай і сярод аднакурснікаў і ў калектыве завочнага факультэта карыстаюцца старасты чацвёртага і пятага курсаў аддзялення рускай мовы і літаратуры Эльміра Сцяпанаўна Горбач, Кацярына Кузьмінічна Паўлоўская, Уладзімір Віктаравіч Кузьміч (пяты курс аддзялення журналістыкі), Ніна Рыгораўна Пранкевіч, староста чацвёртага курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры, староста чацвёртага курса матэматычнага аддзялення Станіслаў Антонавіч Сакалоўскі, староста чацвёртага курса філасофскага аддзялення Аркадзій Наумавіч Сыркін і іншыя.

Як правіла, дысцыплінаваныя, акуратныя, паважаныя старасты самі паспяхова вучацца.

Добра з такімі старастамі!

**К. ВІКТАРАВА.**



**На здымках: лепшыя старасты курсаў Э. С. Горбач, Н. Г. Пранкевіч, С. А. Сакалоўскі.**

## ПРЫСТУПІЛІ ДА ДЫПЛОМНЫХ

У адных зімовая сесія толькі пачынаецца, а ў шасцікурснікаў юрыдычнага аддзялення яна ўжо прайшла. Супрацоўнікі суда, пракуратуры і іншых устаноў, якія паставілі сваёй мэтай атрымаць юрыдычную адукацыю, здалі апошнія перад дыпломнай работай экзамены.

Прыемна адзначыць, што для многіх гэтая сесія была паспяховай. Толькі па адной чацвёрцы (астатнія выдатна) атрымалі Анатоль Фёдаравіч Гарабец, Валянцін Іванавіч Зарэцкі, Сяргей Аляксеевіч Ручкін, Лідзія Пятроўна Сачок, Дзмітрый Пятровіч Успенскі, Анатоль Барысавіч Юрасаў.

Цяпер 102 выпускнікі рыхтуюцца да дыпломнай работы. Вызначана тэматыка, якая ахоплівае найбольш актуальныя пытанні, праводзяцца кансультацыі з кіраўнікамі, падбіраецца неабходная літаратура.

**І. КАНЦАВЫ.**



## У ДОБРЫ ЧАС, ДРУГАКУРСНІК!

Скрыпіць снег пад нагамі праходзячых. І ў гэтым скрыпе нібы чуецца: «Сесія, сесія». Яна цяпер завалодала часам і думкамі завочнікаў. Клапатлівая, пастаянная работа над кнігай у перыяд паміж сесіямі прыносіць свой плён. Многія студэнты паказваюць на экзаменах глыбокія веды, атрымліваюць толькі добрыя і выдатныя адзнакі.

Паспяхова праходзяць экзаменацыйныя сесіі В. В. Корсак, В. А. Каралёў, Л. В. Жалток і іншыя. Аднак, ёсць і такія, што спадзяюцца на «а можа пранясе». Займаюцца мала, і ў канцы непрыемныя вынікі.

Вядома, уплывае на паспяховасць студэнта-завочніка і недахоп новых вучэбных дапаможнікаў. Мы спадзяемся, што рэктарат паклапоціцца аб тым, каб завочнікі былі лепш забяспечаны вучэбнай літаратурай.

А пакуль — жадаем студэнтам - завочнікам поспехаў у зімовай сесіі.

**А. КАЛЯДКА,**
**стараста другога курса завочнага аддзялення юрыдычнага факультэта.**

**НА ЗДЫМКУ: Уладзімір Сцяпанавіч КАРАБАН чытае лекцыю студэнтам-завочнікам шостага курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры.**

# СЯБРЫ МАЕ—ГАЗЕТЧЫКІ

Яны пазнаёміліся перад уступнымі экзаменамі. Тэмай для размовы з'явіўся толькі што надрукаваны ў маладзёжнай газеце верш Пятра Стрыбука «Берёзка на вокзале...». Гэта быў верш пра бярозку, якую не кранулі нават будуючы метро... Тое, што не заўважалі доўга людзі, адразу прыкмеціў газетчык.

Гэты верш зблізіў іх настолькі, што «дадому» ішлі ўжо ўсе разам. А потым знайшлі сабе кватэру на ціхай, зусім не сталічнай вуліцы. Каменціруючы гэтае першае знаёмства, Пётр Стрыбук прадэкламаваў: «...И встретились, как три молочных брата, друг друга не видавшие вообще»,—хоць іх не тры, а чатыры (праўда, чацвёрты прыйшоў значна пазней) і яны зусім не «малочныя».

«Прыйшоўшы пазней» — гэта Барыс Аляксандравіч Сановіч, маёр запасу, былы франтавік, які ў 1941 годзе прама з параду на Краснай плошчы адправіўся ў бой за Маскву, змагаўся пад Сталінградам і разам з баявымі сябрамі вызваляў Сафію, Плоўдзіў, Бухарэст, Белград, Будапешт, быў пад лендарнай Шыпкай і закончыў вайну ў Вене тройчы паранены.

Грудзі Барыса Аляксандравіча зараз упрыгожваюць ордэнскія планкі, па якіх відаць, што Радзіма адзначыла яго подзвігі трыма ардэнамі Чырвонай Зоркі і сямю медалямі.

Мабыць, не ўпершыню расказвае ён сваім новым сябрам Пятру Стрыбуку, Леаніду Крэскіяну і Віктару Пятрушыну пра вайсковыя шляхі-дарогі. Ды і ёсць у яго што ўспомніць, ёсць пра што расказаць!

«...Баі мясцовага значэння», — аб'яўляў 4 снежня 1941 года па радыё Левітан, а мы тым часам збіраліся ў начны пошук «па языка». Шалёна выў вецер, снег замятаў усе сляды, калі наша група ў складзе васьмі чалавек, стаўшы на лыжы, адправілася ў цемру начы.

На шашы мы заўважылі нямецкага рэгуліроўшчыка. Фрыца, відаць, дрэнна грэлі саламяныя эрзац-валёнкі ды нейкая тканіна, адабраная, мабыць, у жанчыны і накручаная на галаву. Ён вырашыў схавацца за дрэва, але не паспеў нават і крыкнуць, як апынуўся на зямлі з кляпам у роце.

Пад раніцу мы вярнуліся да сваіх. Гэта была раніца майго дня нараджэння. Мне было 19. Закончыўся дзень, а ў ноч з пятага на шостае снежня нашы пайшлі ў генеральнае наступленне пад Масквой...».

Барыс Аляксандравіч мог бы ўсю ноч расказваць, але заўтра — экзамен. А ён студэнт-выпускнік завочнага факультэта аддзялення журналістыкі, працуе зараз загадчыкам аддзела пісьмаў у чачэрскай раённай газеце.

Рознымі шляхамі прыйшлі сябры ў журналістыку.

— Я яшчэ ў пятым класе рэдагаваў насценную газету,—расказвае пра сябе Леанід Крэскіян, карэспандэнт-арганізатар раённага радыёвяшчання ў горадзе Паставы. Пасля школы працаваў загадчыкам клуба, мастаном і пісаў у газету. Потым закончыў Брэсцкую школу майстроў-будаўнікоў. Працуючы майстрам змены цагельнага завода, таксама пісаў у газету, рабіў фотаздымкі. З 1962 года пачалася мая непасрэдная журналісцкая дзейнасць у ролі фотакарэспандэнта Бярозаўскай раённай газеты «Маяк камунізма». У гэтым жа годзе я паступіў ва універсітэт.

У вольную хвіліну люблю перачытваць творы Канстанціна Паўстоўскага, Веры Інбер, Валянціна Катаева, Ільфа і Пятрова, Власа Дарашэвіча.

Сябры ўжо даўно ўсё ведаюць адзін аб другім. Таму Віктару Пятрушыну і не прышлося нават расказваць пра сябе. За яго весела расказвае Пятро Стрыбук.

— Наогул, Віцька Пятрушын вельмі цікавы чалавек. На сесію прывозіць два чамаданы кніг, любіць сібірскія пельмені і гульню ў тэніс. Верны журналісцкай справе, ён усё ж аднойчы здрадзіў ёй і пайшоў на камсамольскую работу.

— Ну, гэта было аднойчы, —смяецца Віктар.

Ён сапраўды цікавы чалавек. Быў на будоўлі Брацкай ГЭС і расказваў, як жылі ў палатках і раніцай ва ўсіх былі белыя галовы ад інею. Пры 48-градусным марозе будавалі дэпо, а потым пракладвалі вадаправод ніжэй узроўню Ангары. Пасля Брацкай ГЭС працаваў першым сакратаром Лепельскага РК ЛКСМБ. Зараз зноў у газеце. Чаму? Віктар Пятрушын лічыць, што гэта яго прызванне.

Газета... Прызванне.. Не кожнаму вядома, што хаваецца за гэтымі словамі. Не кожнаму вядома, як цяжка іншы раз прыходзіцца «варыцца ў рэдакцыйнай кухні». І не толькі таму, што «цякучка заядае», але яшчэ і ад розных іншых спраў.

...Жонка супрацоўніка раённай газеты пайшла да зубнога ўрача, ёй паказалася, што ўрач дрэнна працуе. Паскардзілася мужу. Вось тады і з'явіўся на старонках газеты артыкул «Калі імя табе ўрач...» Неабгрунтаваныя факты, лаянка ў адрас урача — усё гэта абурыла людзей. У рэдакцыю сталі прыходзіць пісьмы...

Пётр Стрыбук, супрацоўнік добрушскай раённай газеты «Ленінец» стаў на абарону ўрача, напісаў крытычны артыкул у «Гомельскую праўду» пад аднаіменнай назвай. Урэшце абком прапанаваў аб'явіць вымову супрацоўніку рэдакцыі за тэндэнцыёзны падбор фактаў і грубае іх скажэнне.

— Такія выпадкі хоць і рэдкія, а ўсё ж бываюць,— гаворыць задумёна Пётр Стрыбук.

...Гэта будні ў раённых журналістаў, да ліку якіх належаць Пятро Стрыбук, Леанід Крэскіян, Барыс Саковіч, Віктар Пятрушын. А ў перарывах між працай і адпачынкам яны вучацца. Зараз у іх, як і ва ўсіх студэнтаў, гарачая пара. Свае меркаванні аб сесіі яны выказваюць у жартаўлівай форме.

— Рыхтуемся мы заўсёды сумесна. Па падручнікі прыходзім у апошнюю чаргу і, як звычайна, іх нам не хапае. Але мы не адчайваемся — адзін чытае, а трое слухаюць. Шпаргалак мы не прызнаем. Спадзяемся на ўласную эрудыцыю. Здаваць экзамены ходзім разам, і таму выкладчыкі ўжо нас добра ведаюць і завуць усіх чатырох не інакш, як «Стрыбукі».

А. ПАЎЛЯНКОЎ.

# БІБЛІЯТЭКА—ЗАВОЧНІКУ

**Наступае пара зімовай сесіі завочнікаў. Больш чатырох тысяч чалавек паўстануць перад экзаменатарамі са сваімі справаздачамі аб выкананні вучэбнай праграмы.**

**Супрацоўнікі нашай бібліятэкі ў гэтыя дні стараюцца ў першую чаргу забяспечыць студэнтаў завочнага аддзялення неабходнай літаратурай і такім чынам дапамагчы ім паспяхова здаць экзамены і, акрамя таго, выдзеліць патрэбныя кнігі для наступнай сесіі.**

**З кожным годам наша бібліятэка выдае студэнтам усё больш і больш літаратуры. Так, у мінулым годзе на дамашнім абанеменце было выдадзена 44105 кніг. Яшчэ большую колькасць кніг студэнты атрымалі ў чытальнай зале — 78515 экземпляраў.**

**У час сесіі навучальны дзень запоўнены даадказу, таму хуткая выдача кніг у значнай ступені аблягчае падрыхтоўку да экзаменаў і залікаў.**

**З дапамогай стараст груп, курсаў распаўсюджваецца дыфіцытная літаратура. Гэта таксама эканоміць час. Хутка атрымаўшы кнігу, студэнт зможа больш часу праводзіць у кабінеце ці чытальнай зале.**

**У студэнцкай чытальнай зале арганізаваны адкрыты доступ да кніг. Такі парадак таксама эканоміць дарагі час.**

**У перыяд сесіі завочнікі атрымліваюць да 800 кніг і часопісаў у дзень. Фонд літаратуры сістэматычна папаўняецца.**

**У час паміж сесіямі студэнты-завочнікі, якія жывуць у самых аддаленых раёнах, маюць магчымасць атрымаць неабходныя кнігі па пошце. Для гэтага ў бібліятэцы створан спецыяльны фонд. Рассылка кніг з кожным годам павялічваецца. У 1967 годзе, напрыклад, яна склала 1500 экземпляраў.**

**Але работа наша з чытачамі-завочнікамі не абмяжоўваецца выдачай кніг. На першым курсе бібліятэкары праводзяць спецыяльныя занятк і з завочнікамі, на якіх знаёмяць іх з бібліятэкай, яе структурай і правіламі, вучаць самастойна працаваць з кнігай, каталогамі, картатэкамі і бібліяграфічнымі дапаможнікамі.**

**У бібліятэцы сістэматычна складаюцца спіскі кніг, якія будуць выданы ў бліжэйшы год, каб завочнікі загадзя маглі заказаць неабходную літаратуру для асабістай працы.**

**Але выкананне бібліятэкай сваіх абавязкаў перад чытачамі патрабуе, каб і чытачы поўнасцю выконвалі свае абавязкі перад бібліятэкай. На жаль, многія студэнты часта забываюць правілы карыстання бібліятэкай, парушаюць іх. Адмоўна ўплываюць на работу бібліятэкі выпадкі, калі студэнты губляюць або псуюць кнігі, не своечасова іх вяртаюць.**

**На дамашнім абанеменце бібліятэкі ў цяперашні час налічваецца больш 300 чытачоў-завочнікаў, якія не здаюць кнігі на працягу аднаго-двух і больш гадоў. Назавем некалькі прозвішчаў: М. А. Шут, С. І. Федасеенка, Г. А. Якавенка, У. А. Дубовік (філалагічны факультэт); В. В. Авадкоў, І. І. Люлева (гістфак); С. С. Юневіч, Г. У. Богдэль, І. А. Колік (біяфак); журналіст М. Г. Шуранкоў і іншыя. Гэтыя студэнты забываюць, што, затрымліваючы кнігі, яны падводзяць сваіх сяброў — іншых завочнікаў.**

**Многа даўжнікоў і ў чытальнай зале. Сярод іх філолагі О. Ф. Філончык, Л. В. Літвін, Т. О. Тукала, Н. І. Стома, Б. С., юрысты Б. С. Сторажаў, Г. Р. Чэхоўская, журналіст Л. Ф. Дубаневіч, гісторык М. М. Жораў, матэматык Н. А. Бурлакова і іншыя.**

**І ўсё ж мы спадзяемся, што даўжнікі перастануць быць даўжнікамі і вернуць бібліятэчныя кнігі.**

**Супрацоўнікі бібліятэкі ў сваю чаргу зробяць усё, каб забяспечыць патрэбнымі кнігамі ўсіх завочнікаў.**

**А. ДРАЗДОЎСКІ.**

## НАШЫ КЛОПАТЫ

**Складаная работа метадыстаў завочнага факультэта. Для таго, каб правільна арганізаваць навучальны працэс, яны павінны ведаць многае: аб'ем работы кафедраў, нагрузку выкладчыкаў; умела складаць працоўныя і навучальныя планы і расклады. Гэтая работа вядзецца на працягу ўсяго навучальнага года.**

**Самы ж цяжкі час — прыезд студэнтаў на сесію. Пачынаецца яна адначасова на ўсіх аддзяленнях, таму ва ўніверсітэт прыязджае адразу каля чатырох тысяч чалавек. Кожны студэнт-завочнік павінен пабываць у «свайго» метадыста, адзначыць кантрольныя работы, залікі і экзамены, вырашыць цэлы шэраг хвалюючых яго пытанняў. Метадысты ведаюць кожнага студэнта: якая ў яго паспяховасць, ці ёсць запазычанасць.**

**Кожны метадыст вядзе пэўны факультэт ці аддзяленне. Так, Тамара Рыгораўна Каўхута — аддзялення журналістыкі і беларускай і рускай мовы; Таіса Адамаўна Шафаронак — аддзяленні гісторыі і філасофіі; Генрыета Анатольеўна Дунаева — геаграфіі і матэматыкі. Надзежда Вікенцьеўна Зюба — аддз. біялогіі; Валянціна Сцяпанаўна Бранавец — юрыдычнае.**

**Складанасць правядзення сесіі заключаецца яшчэ ў тым, што занятк і праходзяць ва ўсіх карпусах, для паточных лекцый не хапае вялікіх аўдыторый. Цесна і ў кабінетах самога факультэта, асабліва ў пакоях сакратароў, дзе працуе сем чалавек. Калі ўвайшлі двое наведвальнікаў, то разысціся ім ужо цяжка. Бываюць іншыя недахопы, хоць і нязначныя, але яны перашкаджаюць працаваць. Так, у нашых пакоях не хапае сталоў, няма штор на вокнах, дрэнна мы забяспечаны паперай і канцылярскімі прыладамі.**

**Адыйдзе экзаменацыйная напружанасць, але водгулле яе яшчэ доўга будзе адчувацца на факультэце. Не зменшыцца спраў і ў метадыстаў. Яны, як і раней, паўсядзённа будуць дапамагаць тым, хто імкнецца атрымаць адукацыю ва універсітэце.**

**В. КАЛЕКАН,**
**метадыст аддзялення рускай мовы і літаратуры.**

## Падручнікаў будзе больш

Хто са студэнтаў не адчуваў горкае пачуццё, калі раптам здаралася, што патрэбную кнігу не знайсці ні ў бібліятэцы, ні ў кабінеце?

У апошні час вучэбнай літаратуры стала значна больш, аднак ёсць вядучыя курсы, асабліва новыя, па якіх падручнікі яшчэ не выдадзены. Патрабуецца пераапрацоўка многіх старых падручнікаў. Таму бібліятэкі вну, у тым ліку і наша універсітэцкая, прымаюць усё большы ўдзел у складанні выдавецкіх планаў з тым, каб неабходнай літаратуры выпускалася яшчэ больш.

Так, па запатрабванню цэнтральнай навукова-метадычнай бібліятэчнай камісіі мы паслалі ў Маскву спісы вучэбнай і навуковай літаратуры (143 назвы). І вельмі прыемна, што многае з прапанаванага ўключана ў тэматычныя планы выдавецтваў.

Выйшлі ўжо з друку «Курс аналітычнай геаметрыі» Н. І. Мусхелішвілі, «Метады інтэгрыравання звычайных дыферэнцыяльных ураўненняў» Н. І. Матвеева, «Генетыка» Лабанава і іншыя.

На 1968 год запланавана выданне падручнікаў, якія ўжо сталі бібліяграфічнай рэдкасцю: «Гісторыя паўднёвых і заходніх славян», «Гісторыя старажытнага Усходу», падручнікі па лацінскай і старaславянскай мовах, хрэстаматыя па зарубежнай літаратуры XVIII века.

Штогод у бібліятэцы складаюцца спісы падручнікаў і навуковых дапаможнікаў, запланаваных выдавецтвамі. Аб выхадзе іх у свет інфармуе наш стэнд «Новыя падручнікі і вучэбныя дапаможнкі». На гэтым жа стэндзе заўсёды ёсць апошні нумар газеты «Книжное обозрение», якая паведамляе аб выхадзе кніг за тыдзень. Гэта дае студэнтам магчымасць загадзя паклапаціцца аб камплектаванні сваёй вучэбнай бібліятэкі.

Цяпер на абанеменце, у студэнцкай чытальнай зале і на завочным факультэце можна пазнаёміцца са спісам літаратуры, якая рыхтуецца да выпуску ў 1968 і першым квартале 1969 года. У канцы яго дадзены адрасы магазінаў, якія маюць аддзелы «Кніга — поштай».

Я прыводжу толькі некаторыя назвы з гэтага спіса па грамадскіх навуках — курс палітычнай эканоміі ў двух тамах, пад рэдакцыяй Н. А. Цагалова; «Гісторыя КПСС» (вучэбна-метадычны дапаможнік для завочнікаў). У выдавецтве «Просвещение» выйдуць новыя падручнікі па педагогіцы.

Для студэнтаў-біёлагаў — «Біяфізіка» Б. Н. Тарусова, «Агульная цыталогія» А. В. Канстанцінава і іншыя.

Многа літаратуры будзе выдадзена для геолагаў і геаграфаў, матэматыкаў, філолагаў, журналістаў. Сярод аўтараў — знаёмыя імёны выкладчыкаў універсітэта: Д. М. Карулін («Геалогія і карысныя выкапні СССР»), А. Х. Турэцкі («Тэорыя інтэрпаліравання ў задачах»), А. А. Гусак («Дапаможнік да рашэння задач па вышэйшай матэматыцы»), П. П. Ахрыменка і М. Р. Ларчанка («Старажытная беларуская літаратура»), Н. Г. Булахаў («Беларуская мова») і іншыя.

Больш поўна аб навінках вучэбнай літаратуры можна даведацца, пазнаёміўшыся з нашым спісам.

Л. ЗРУБОВІЧ,
бібліятэкар.

# НОВЫ ГОД У В'ЕТНАМЕ

*Калі ў вас у самым разгары зіма, да нас, на нашу зямлю, прыходзіць вясна. В'ентамцы вельмі любяць яе. У ноч з дваццаць дзевятага на трыццатае студзеня мы сустракаем Новы год па месячнаму календару. Па-в'етнамску яго завуць Тэт.*

*У навагоднія дні прырода становіцца самай прыгожай. Усюды кветкі: на палях, у садах, нават на стылах, за якімі працуюць людзі. Усе вітаюць адзін аднаго кветкамі, прыпадносяць іх як самы дарагі падарунак, выказваючы свае лепшыя пачуцці і пажаданні ў жыцці, працы і вучобе. Новы год у нас—вялікае нацыянальнае свята. Да яго рыхтуюць самыя смачныя стравы, каб частаваць сваіх сяброў і знаёмых. Юнакі і дзяўчаты выконваюць народныя танцы і пяюць песні каля ёлкі. Але ёлка ў нас адрозніваецца ад вашай. Яна з бамбука.*

*Ужо не першы год в'етнамскі народ сустракае свята ў абставінах вайны. Бомбы падаюць і рвуцца нават у дні свят. І людзі вымушаны святкаваць не пакідаючы сваіх баявых пастоў. Яны даюць належны адпор ворагам і гэтым набліжаюць час перамогі на нашай зямлі.*

*ДЗІН БАН ТХОНГ.*

*ЖЫЦЦЁ ЗАМЕЖНЫХ СТУДЭНТАЎ*

# АДПАЧЫНАК У ІХ ЗАСЛУЖАНЫ

Як справаздачу перад сваімі народамі трымалі экзамены замежныя студэнты ў гэтую сесію. З года ў год вучацца выдатна студэнт хімічнага факультэта кубінец Барыс Ла Сэрна, танзанійскі студэнт матэматычнага факультэта Чарльз Сонпал Водвард і в'етнамскі студэнт фізічнага факультэта Та Хынг Квы. Гэта, можна сказаць, ветэраны выдатнай вучобы. Не адстаюць ад іх і в'етнамскі студэнт фізфака Ву Зуй Фу, кубінка з геафака Раіса Барэра, афрыканец з фізфака Джон Флетчар і многія іншыя.

Даволі складанай была сесія ў студэнтаў падрыхтоўчага факультэта. Але прайшла яна паспяхова. Гэта могуць пацвердзіць вынікі экзаменацыйнай сесіі. Са 128 студэнтаў, якія здавалі экзамен па рускай мове, 30 студэнтаў атрымалі «выдатна», 59 — «добра», астатнія— «здавальняюча». На заліку па матэматыцы 44 студэнты атрымалі выдатныя адзнакі, 58 — добрыя.

Нгуен Дык Х'ен, студэнт падрыхтоўчага факультэта, стаў «абсалютным» выдатнікам. Па рускай мове, матэматыцы, фізіцы, хіміі і чарчэнню ён атрымаў пяцёркі. Сярод студэнтаў, што атрымалі толькі па адной чацвёрцы, Ву Зоан М'ен, Фунг Ван Зуан, Нгуен Шы Лок, Нгуен Дзінь Вінь, Ву Туан Ань, Ле Дык Зы, Чан Тат Тханг і іншыя.

Зараз у нашых замежных сяброў, як і ва ўсіх студэнтаў, зімовыя канікулы. Амаль усе яны адпачнуць ў аздараўленчым лагеры «Сасновы Бор», дзе спазнаюць усе якасці беларускай зімы. Тут можна будзе пахадзіць на лыжах, прыняць удзел у спартыўных і многіх іншых мерапрыемствах. Студэнты спецыялізаваных факультэтаў (фізічнага, хімічнага, біялагагічнага і іншых) зробяць цікавыя экскурсіі. У лютым, калі замежныя студэнты вернуцца з «Сасновага Бору», іх чакае экскурсія на камвольны камбінат. Тут адбудзецца вечар сустрэчы з рабочай моладдзю. У канцэрце прымуць удзел і нашы в'етнамскія сябры. Зараз яны дружна рыхтуюцца да выступлення.

У інтэрнаце, дзе жывуць замежныя студэнты, будзе праведзены шахматна-шашачны турнір. Юнакі і дзяўчаты пабываюць у цырку.

У нашых в'етнамскіх сяброў у час канікул — вялікая радасць — набліжаецца Новы год па месячнаму календару. Мы віншуем іх са святам і жадаем шчасця, новых поспехаў у вучобе, а іх Радзіме новых поспехаў у барацьбе з амерыканскімі агрэсарамі і ў будаўніцтве сацыялізма.

Ц. СТАРЧАНКА,
Р. ЛУЧАНОК.



У актавай зале галоўнага корпуса сабраліся выкладчыкі тэхнікумаў г. Мінска і Мінскай вобласці. Яны праслухалі шэраг лекцый педагагічнай тэматыкі.
На здымку: у час перапынку выкладчыкі дзеляцца ўражаннямі. Фота І. АСКІРКІ.

ТВОРЧАСЦЬ ЗАВОЧНІКАЎ

## КАБ НЕ ВАЙНА

І я б зямлю араў.
Траву б касіў і сеяў хлеб.
Рукамі дужымі цагліны б клаў
І мо паехаў бы ў далёкі стэп,
Там горад будаваў,
Ці пасадзіў бы лес густы...
Каб не вайна
І не рукаў пусты.

М. ГОРБА.

## *БАЛАДА ПРА ВЁСЛЫ*

І

Хваліўся дзед:
— Такія вёслы,
Не даў бы нават за карову!
Я мажа іх у музей
аднёс бы,
Ды сумна будзе мне
старому.
І дзед расказваў,
як паўвека,
Адзінай лодкаю багаты,
Куфэрак вёз з дубовым
векам,
А побач — любую Агату.
Калі нявесту цалаваў ён,
Чароты ў зайздрасці нямелі,
Надоўга моўклі вёслы
ў хвалях,
Па-змоўніцку ўсё разумелі...

II

— О-го-го!!! Мы што
казалі!
Наш вадзянік зноў
з хлебам, з соллю...
Цалуюць дзеда партызаны,
Вядуць на юшку
у сасоннік...

III

Шуміць над пуняй ціха
хвоя
А дзед сваё: — Мы не
патрэбны.
Вунь тыя ж вёслы пад
страхою —
Праз дах дзіравы спіны
грэюць...
Глядзіш — і сэрцу стане
горка:
Цяпер малы ім ў вёсцы
гонар.
Па сена едуць
на маторках,
Аж свішча вецер —
так іх гоняць!

М. ПАНАСЮК.

# ГЕРБ ДЫНАСТЫІ ШУРПО

Па сямейнай традыцыі Уладзімір Шурпо павінен быў стаць кавалём або столерам. З даўніх часоў вёска Краснаполле, што на Гомельшчыне, славілася выдатнымі майстрамі кавальскай і будаўнічай справы. І амаль кожны з майстроў насіў адно і тое ж прозвішча — Шурпо. Ад дзеда да бацькі, ад бацькі да дзяцей перадаваліся сакрэты нялёгкіх прафесій. Ні самі Шурпо, ні аднавяскоўцы нічога ў гэтым дрэннага не бачылі: усё, што выходзіла з-пад рук умельцаў, было моцным і прыгожым. Марку «Шурпо» ведалі далёка за Рэчыцкай акругай.

Першым сямейную традыцыю парушыў бацька Уладзіміра — Архіп Шурпо. У 1928 годзе ён прыйшоў з арміі камуністам, стаў адным з арганізатараў калгаса, пачаў закладаць першыя бярвенні ў грамадскія будоўлі. Надзвычай працавіты і чуллівы, ён карыстаўся вялікай павагай аднавяскоўцаў. Відаць, таму і выбралі калгаснікі Архіпа Шурпо старшынёй сельсавета.

На гэтай пасадзе ён і будаваў новае жыццё. Багацеў калгас. Расла сям'я Шурпо. Дачка перад вайной паступіла ў інстытут, а малодшыя пяць сыноў вучыліся ў школе. З маленства бацька прывіваў любоў да працы. Бывала, прыйдзе з работы, дасць кожнаму сякеру ў рукі і вядзе цэлую брыгаду на дапамогу суседу, які ўзводзіць сцены новай хаты. А вечарам, гледзячы, з якім апетытам мужчыны ўплятаюць бульбу, маці ўсміхалася:

— На бульбу зарабілі, а за сала і малако яшчэ адпрацаваць прыдзецца. Сядайце за кнігі і выконвайце ўрокі.

Бацька садзіўся разам з сынамі. Яму ўдалося закончыць толькі чатыры класы, а праца ў сельсавеце з кожным годам патрабавала ўсё большых і большых ведаў. У вёсцы вячэрняй школы яшчэ на той час не было, вось і прыходзілася вучыцца самастойна па кніжках сыноў. Нават пагаварваў аб здачы экзаменаў за сямігодку...

Вайна ўсё пераблытала, а многае і зусім адабрала. Цяпер ужо рэдка сям'я сабіралася за адным сталом. Старшыня сельсавета камуніст Шурпо разам са старэйшым сынам Георгам пайшоў у партызаны і са зброяй у руках змагаўся супроць фашысцкіх захопнікаў. Удваіх яны і пайшлі пасля на фронт, адкуль Архіп ужо не вярнуўся.

Цяжка было пачынаць сынам самастойнае жыццё, але запал працавітасці, які атрымалі яны ў спадчыну ад бацькі, дапамагаў. Ён і цяпер дапамагае пераадольваць усе перашкоды да мэты.

Уладзіміру, як і яго братам, удалося скончыць сем класаў. Прайшоўшы кароткі курс навучання ў ФЗН, ён пачаў працаваць на будоўлях Тураўскага раёна. Пасля — служба ў арміі. Некаторы час слясарыў у МТС. У 1957 годзе Уладзімір Шурпо — токар інструментальнага завода ў Мінску. І тут здарылася нешта падобнае, што калісьці адбылося з бацькам. Райком камсамола рэкамендаваў яго як лепшага рабочага-актывіста ў органы міліцыі. Уладзімір згадзіўся. І вось ужо дзесяць год ён сярод тых, хто знаходзіцца на пярэднім краі барацьбы за грамадскі парадак. Ад паставога да адказнага супрацоўніка рэспубліканскага ўпраўлення міліцыі — такі шлях яго за гэты час.

Узорнае выкананне абавязкаў — гэта толькі адзін з сакрэтаў павышэння ў службовай пасадзе. Уладзімір Архіпавіч усе гэтыя гады вучыцца. І, канешне, вучыцца прыходзіцца толькі ў вольны ад працы час. Тры гады вучыўся ў вячэрняй школе. Пасля заканчэння адразу ж паступіў на завочнае аддзяленне юрыдычнага факультэта універсітэта. Нядаўна ён здаў экзамены апошняй сесіі, а цяпер працуе над дыпломнай.

Цяжка? Безумоўна. Дзевяць гадоў сумяшчаць працу і вучобу... Але ж нельга здраджваць сямейнай традыцыі. Так-так, Уладзімір Архіпавіч, як і яго бацька, не парушыў сямейную традыцыю, бо галоўнае яе патрабаванне — быць выдатным спецыялістам сваёй справы, прыносіць карысць людзям. Дарэчы, браты яго таксама не звярнулі з дарогі бацькі. Павел — інжынер у калгасе, Віктар і Барыс працуюць інжынерамі ў Мінску і заканчваюць завочнае аддзяленне Палітэхнічнага інстытута.

На юрыдычным факультэце пра Уладзіміра Архіпавіча выкладчыкі гавораць так:

— У выдатніках не хадзіў, але веды ў яго глыбокія, трывалыя. Да таго ж у яго такія рысы характару, якія проста неабходны юрысту: прынцыповасць, павага да людзей, пачуццё адказнасці за даручаную справу.

Да гэтай характарыстыкі я дадаў бы яшчэ адну. Уладзімір Архіпавіч — нядрэнны чалавеказнаўца. Глыбей пазнаць унутраны свет чалавека яму дапамагае захапленне літаратурай і мастацтвам. Асабістая бібліятэка старшага лейтэнанта можа мерацца з многімі бібліятэкамі выкладчыкаў. А калі сабраць усе намаляваныя Уладзімірам Архіпавічам карціны, эцюды, можна было б запоўніць вялікую выставачную залу. Асабліва любіць ён лясныя пейзажы. Выкананыя ім эцюды напоўнены сонечным светам, яркімі фарбамі.

Ведаючы Уладзіміра Архіпавіча як здольнага мастака, я быў здзіўлены, калі ў яго кватэры ўбачыў усяго толькі некалькі карцін. А дзе ж уся «галерэя»? Выяўляецца: у доме нумар сем па вуліцы Кнорына, дзе жыве Шурпо, няма ніводнай кватэры без шматкаляровых эцюдаў Уладзіміра Архіпавіча. Яны прыносяць людзям пачуццё прыгожага.

Неяк я спытаў Уладзіміра Архіпавіча, як намаляваў бы ён сямейны герб. Ён задумаўся:

— Пасярэдзіне скрыжаваў бы кавальскі молат і сякеру... Іх трымалі рукі дзядоў і бацькі. Зверху намаляваў бы кніжку — адзнаку таго, што сыны пайшлі далей, у навуку. І, мабыць, усё гэта акаймаваў бы вянком, сплеценым з кронцыркуля, лагарыфмічнай лінейкі і іншых прылад інжынера... Як ніяк, а ў нашай сям'і цяпер тры інжынеры.

Мне цяжка ўявіць, якім быў бы гэты герб, але здаецца, прыгожым, як само жыццё, якое прысвячаецца служэнню людзям.

У. БЛАКІТНЫ.

СПОРТ

# ЗВІНЯЦЬ МЯЧЫ НАД СЕТКАЙ

Нядаўна закончылася першынство па валейболу сярод супрацоўнікаў фізічнага факультэта. Сем дзён працягваліся гарачыя паядынкі ў спартыўнай зале галоўнага корпуса. У спаборніцтвах прынялі ўдзел 54 чалавекі з сямі каманд, якія ў асноўным з'яўляюцца зборнымі двух-трох кафедраў. Мацнейшай аказалася каманда кафедры радыефізікі, якую узначальваюць ігракі зборнай універсітэта Турчанаў і Ільюшчанка. Выйграўшы ва ўсіх сапернікаў, яны сталі чэмпіёнамі факультэта. Другое месца заняла каманда кафедраў фізікі цвёрдага рэчыва і паўправаднікоў; на трэцім месцы аказалася зборная каманда кафедраў фізікі, тэарэтычнай фізікі і ЭММ.

Найбольш важным у такіх спаборніцтвах з'яўляецца, вядома, не занятае месца, а ўдзел у спаборніцтвах, прылучэнне да фізічнай культуры вялікай колькасці навуковых супрацоўнікаў і выкладчыкаў.

У гульнях прымалі ўдзел не толькі самыя малады супрацоўнікі; прыемна было бачыць на пляцоўцы дацэнтаў М. М. Паснова, І. П. Зяцькова, ст. в. В. А. Баркана і іншых. Важна і тое, што пасля спаборніцтваў многія супрацоўнікі фізфака загарэліся жаданнем рэгулярна займацца валейболам. Неабходна, каб мясцком і кафедра фізвыхавання пайшлі насустрач нам і выдзелілі дадатковы час для трэніровак супрацоўнікаў фізфака. Да гэтай пары шматлікі калектыў супрацоўнікаў універсітэта вымушан карыстацца двумя-трымя гадзінамі трэніровачнага часу у спортзалах. Таму такія спаборніцтвы пакуль што не сталі рэгулярнымі, асабліва на іншых факультэтах.

Распачатая круглагадовая спартакіяда супрацоўнікаў універсітэта, якую праводзіць мясцком, таксама павінна абапірацца на развіццё і пашырэнне трэніровачнай працы не толькі сярод студэнтаў, але і сярод выкладчыкаў.

Не забывайце нас, дарагія таварышы трэнеры!

В. ПРАКОШЫН,
ст. выкладчык фізфака.

Рэдактар М. І. ЮСЬКА.

Зак. 177. АТ 01047. Наш адрас: Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон Б-2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда».